■ Фестывалім!

У ДЖАЗЕ НЕ ТОЛЬКІ... МІНСК

На мінулым тыдні ў сталіцы праходзіў II Міжнародны фестываль джаза «AlfaJAZZinMINSK-2013».

Самы тытулаваны гурт планеты «TAKE 6» у Палацы Рэспублікі

ЮНЕСКА прызнала джаз здабыткам свету. Зарадзілася гэтая музыка сярод афраамерыканцаў. Аднак за крыху больш чым 100-гадовую гісторыю яна займела сваіх прыхільнікаў сярод прадстаўнікоў розных нацый на ўсіх кантынентах.

У Беларусі джазавая супольнасць сёння групуецца вакол «Джаз-клуба Яўгена Уладзімірава», стваральнік якога і сам актыўна выконвае такую музыку, шмат выступае. Разам з Уладзімірам Карагіным яны з'яўляюцца аднымі з галоўных папулярызатараў джаза. Яны імкнуцца даносіць яго і па-за межы сталіцы. У мінулым годзе джазмены ездзілі ў Ваўкавыск і выступалі ў музычнай школе. Яны прыгадваюць, што разам з дзецьмі на іх канцэрт прыйшлі і бацькі, на вачах якіх блішчалі слёзы, бо яны ніколі раней не чулі джаза ўжывую і былі проста ў захапленні. Вялікая зацікаўленасць публікі ўразіла выканаўцаў, таму сёлета 29 снежня джаз зноў будзе гучаць у Ваўкавыску.

Пакуль жа падмосткі сталічных палацаў і клубаў прынялі «зорак» сусветнай велічыні на фестывалі «AlfaJAZZinMINSK-2013». На ўрачыстым адкрыцці фестывалю выступіў самы тытулаваны гурт планеты «TAKE 6». На яго рахунку ажно 10 статуэтак прэстыжнай музычнай прэміі «Грэмі». І яшчэ 18 разоў яны былі на яе намінаваны. Гэтыя выканаўцы найбольш яскрава адлюстроўваюць сучасныя спевы а капэла — без музычнага суправаджэння. Голас кожнага з шасці ўдзельнікаў каманды абсалютна ўнікальны. Яны маюць розныя тэмбры, могуць нават імітаваць гучанне музычных інструментаў. Афраамерыканскія мужчыны, што спяваюць ужо больш за 30 гадоў, з гастрольнымі турамі некалькі разоў аб'ехалі планету. І сёлета нарэшце дабраліся да Мінска. Кажуць, што, паслухаўшы гэты гурт, многія бацькі адводзяць сваіх дзяцей у вакальную студыю. Бо тое, на што здольныя галасы гэтых спевакоў, сапраўды вельмі ўражвае.

Раней лічылася, што выканаўцы такога высокага ўзроўню Беларусі недаступныя, што іх райдары занадта высокія. Аднак Уладзімір Карагін расказаў, што тыя, хто ўсё-такі завітаў да нас з Вашынгтона, Нью-Ёрка, Лондана, Берліна, былі натхнёныя Яўгенам Уладзіміравым, яго камандай музыкантаў і вельмі палюбілі нашу сталіцу. Цяпер многія імкнуцца вярнуцца сюды зноў, і не адзін раз. І справа тут не толькі ў прыгажосці краіны і добра выхаваных людзях. Знакамітыя музыканты, па словах Карагіна, адзначаюць, што наша публіка — самая ўдзячная.

Славутыя сусветныя «зоркі» джаза і айчынныя выканаўцы выступалі ў Палацы Рэспублікі і Джаз-клубе, які знаходзіцца ў ім, у Палацы прафсаюзаў. Расклад іх канцэртаў ёсць на сайце jazzclub.by. Акрамя выступленняў, адбыліся і майстар-класы. Прычым многія з іх ладзіліся прама падчас 20-хвілінных антрактаў паміж аддзяленнямі канцэртаў. Артысты расказалі, як правільна іграць на саксафоне, каб ён гучаў так, як у аркестры Дзюка Элінгтона. Спявачкі паказалі, як імправізаваць, нават не маючы пастаўленага голасу, — любы прысутны зможа выйсці наперад і зрабіць гэта. Піяністы вучылі іграць мелодыі без нот. Бо сапраўдны джаз, як вядома, — гэта імправізацыя.

І хоць лістападаўскі фестываль толькі скончыўся, хочацца забегчы наперад і падзяліцца прыемнай навіной. З 23 па 25 мая 2014 года, якраз падчас чэмпіянату свету па хакеі, у Мінску адбудзецца яшчэ адзін фестываль джаза. Прычым пад адкрытым небам — у парку імя Горкага. Больш за 20 калектываў з розных краін спецыяльна прыедуць у Мінск. Уваход амаль на ўсе канцэрты будзе бясплатным.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ

■ Саюзная спадчына

Душа народа — у спрадвечных гуках. Як захаваць?

У Санкт-Пецярбургу адбыўся экспертна-медыйны семінар, прысвечаны праблемам сучаснай этнамузыкалогіі Расіі і Беларусі. Мерапрыемства праходзіла пры актыўнай падтрымцы Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы. Упершыню вядучыя расійскія і беларускія спецыялісты сабраліся, каб абмеркаваць цяжкасці ў захаванні і вывучэнні гукавых фальклорных архіваў краін-суседзяў. У межах семінара працаваў «круглы стол», на пасяджэнні якога ўдзельнікі паспрабавалі адшукаць шляхі вяртання нацыянальнага багацця ў культурнае жыццё грамадства.

Інтэрнэт ратуе спадчыну

А вяртаць ёсць што. Так, у фанаграм-архіве Інстытута рускай літаратуры РАН захоўваюцца найкаштоўнейшыя калекцыі беларускага фальклору, самая ранняя з якіх датуецца 1908 годам. Аднак беларускія даследчыкі пакуль не маюць магчымасці папрацаваць з гэтымі запісамі, многія з якіх, дарэчы, дагэтуль маюць патрэбу ў расшыфроўцы, алічбоўцы, каментаванні і г.д. Менавіта таму наспела неабходнасць у стварэнні дубль-архіва, лічыць загадчык фанаграмархіва ІРЛІ РАН Юрый Марчанка. Тым не менш удзельнікі семінара сышліся ў меркаванні, што пакуль гэтая ідэя з'яўляецца непад'ёмнай. Таму ідэальным выйсцем з сітуацыі бачыцца стварэнне агульнага электроннага рэсурсу кшталту інтэрнэт-партала, з дапамогай якога можна наладзіць сістэматычны абмен архіўнай інфармацыяй паміж беларускімі і расійскімі навукоўцамі. І ўжо ў далейшым падобны віртуальны праект можа стаць рэальнай пляцоўкай для фарміравання дубль-фондаў.

Пераемнасць пакаленняў — пад пагрозай

Яшчэ адна праблема, якую адзначылі спецыялісты, — кадравы голад. Калі ў расійскіх музычных ВНУ дзе-нідзе ёсць аддзяленні этнамузыкалогіі (напрыклад, у Санкт-Пецярбургскай кансерваторыі імя Рымскага-Корсакава), то ў нашай краіне адпаведную спецыяльнасць можна атрымаць толькі на кафедры беларусістыкі ў Акадэміі музыкі. Зразумела, розніца ва ўзроўні падрыхтоўкі — адчувальная. Вось і атрымліваецца, што ў Расіі музычных фальклярыстаў проста мала, а ў Беларусі — катастрафічна мала. «Пакуль яшчэ працуюць Зінаіда Мажэйка, Тамара Варфаламеева, Тамара Якіменка — знакавыя фігуры айчыннай этнамузыкалогіі. Але хто прыйдзе на змену ім? — разважае малодшы супрацоўнік Дзяржаўнага навуковага ўніверсітэта «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі Таццяна Канстанцінава. — Пераемнасці пакаленняў, на жаль, няма. У аспірантуры Акадэміі музыкі зараз вучыцца толькі адна дзяўчына, якая збіраецца звязаць сваё жыццё з музычным фальклорам». Тым не менш, як адзначыла старшы навуковы супрацоўнік лабараторыі па вывучэнні традыцыйных культур Расійскай Акадэміі музыкі імя Гнесіных Ларыса Белагурава, гэтая праблема актуальна і для Масквы. «Студэнты не хочуць ісці ў этнамузыколагі. На жаль, прэстыж гэтай прафесіі зараз нязначны. І гэтую сітуацыю трэба выпраўляць — праз актыўнае супрацоўніцтва са СМІ, арганізацыю сумесных фальклорных экспедыцый для беларускіх і расійскіх студэнтаў, рэгулярнае правядзенне навуковых канферэнцый».

Калі мы не ўспрымаем жывую інтанацыю народнай музыкі — значыць мы паступова перастаём разумець музыку ўвогуле, і яна пераўтвараецца ў тое «тыц-тыц», што гучыць у начных клубах.

Фальклор як нешта чужароднае...

Дарэчы, асобна ўдзельнікі семінара агучылі праблему адсутнасці на тэлебачанні праграм, у якіх гучалі бы народныя песні ў іх арыгінальным выглядзе. «Для пераважнай большасці сучаснікаў народная песня ў аўтэнтычным гучанні — гэта ўжо чужая мова. І гэта страшна. Калі мы не ўспрымаем жывую інтанацыю народнай музыкі — значыць, мы паступова перастаём разумець музыку ўвогуле і яна пераўтвараецца ў тое «тыц-тыц», што гучыць у начных клубах, — распавядае намеснік кафедры этнамузыкалогіі Санкт-Пецярбургскай кансерваторыі Галіна Лабкова. — Раней на тэлеканале «Культура» быў шэраг праграм, у якіх развіваўся фальклорны кірунак — «Вандроўкі музыканта», «Невядомая вёска», «Сусветная вёска». Але гэтыя студыі чамусьці закрылі. Іншая справа, калі б не было попыту на падобныя перадачы. Тым не менш згаданыя праграмы мінулых гадоў алічбаваны і растыражаваны ў інтэрнэце! Значыць, многім гэта патрэбна і цікава».

Варта адзначыць, што на беларускім тэлебачанні існуе падобны праект — перадача «Наперад у мінулае», якая ідзе на тэлеканале «Беларусь 3». Творчая група ў кампаніі з сучасным артыстам накіроўваецца ў беларускую глыбінку, дзе запісвае песні ў выкананні вясковых бабулек. І на гэтыя кампазіцыі робяцца сучасныя аранжыроўкі. Паралельна ідзе расповед пра пэўную мясцовасць — народную песенную творчасць, абрады, промыслы. Здаецца, добрая ініцыятыва, але, шчыра кажучы, гэта кропля ў моры, бачаць якую нямногія. Даступнасць музычнай спадчыны так і застаецца... праблемай.

❍❍❍

Напрыканцы семінара спецыялісты дамовіліся падпісаць рэзалюцыю з прапановамі па рашэнні азначаных праблем і накіраваць яе ў Пастаянны камітэт Саюзнай дзяржавы.

Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ.
Мінск—Санкт-Пецярбург—Мінск

Даты | Падзеі | Людзі

1770 год — нарадзіўся Іван Крузенштэрн, рускі мараплавец, адмірал. У жніўні 1806 года жыхары Санкт-Пецярбурга атрымалі радасную вестку. З першага рускага кругасветнага падарожжа вярнуліся два караблі — «Нява» і «Надзея». Экспедыцыю ўзначальваў вопытны мараплавец — капітан Іван Фёдаравіч Крузенштэрн. За тры гады плавання было адкрыта мноства астравоў у Цяхім акіяне і праведзены навуковыя даследаванні, якія паклалі пачатак новай навуцы — акіянаграфіі. Яшчэ адна старонка біяграфіі Крузенштэрна — яго 16-гадовая дзейнасць на пасадзе дырэктара Марскога корпуса. За гэты час былі ўведзены новыя вучэбныя дысцыпліны, папоўніліся найноўшымі навучальнымі дапаможнікамі бібліятэкі і быў створаны афіцэрскі клас. У 1874 годзе насупраць Марскога корпуса адміралу Крузенштэрну быў узведзены помнік.

1961 год — нарадзіўся (г. Салігорск Мінскай вобласці) Міхаіл Анатольевіч Жураўкоў, беларускі вучоны ў галіне механікі і геамеханікі, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар. Аўтар навуковых прац па механіцы дэфармаванага цвёрдага цела і метадах інтэгральных ураўненняў у ёй, геамеханіцы, матэматычным і камп'ютарным мадэляванні геамеханічных працэсаў, геаманіторынгавых сістэмах.

1986 год — Вярхоўны Савет СССР прыняў закон аб індывідуальнай працоўнай дзейнасці, які паклаў пачатак развіццю малога бізнесу ў рамках адміністрацыйна-камандной эканомікі. Міхаіл Гарбачоў і яго паплечнікі, прыводзячы ў якасці прыкладу рэформы часоў НЭПа, былі ўпэўнены ў тым, што індывідуальная працоўная дзейнасць ва ўмовах сацыялізму цалкам адпавядае марксісцкім ідэалам. Аб будучым развале СССР у 1986 годзе яшчэ ніхто і не думаў, але пазбаўленне дзяржавы манаполіі на вытворчасць, продаж тавараў і аказанне паслуг аказалася не менш сур'ёзным ударам па сістэме, чым палітычныя свабоды. Эканамічна актыўнае насельніцтва хутка ацаніла перавагі новага закона, які ўступіў у дзеянне з 1 мая 1987 года. Разам з заканадаўствам аб кааперацыі стваралася легальная аснова для хуткага ўзбагачэння. Умовы для работы бізнесменаў часоў перабудовы былі ў цэлым больш камфортнымі, чым пры НЭПе, калі савецкая ўлада жорстка кантралявала прыватны сектар і разглядала яго як «часовую ўступку капіталізму». Артадоксы ў радах КПСС хутка выкрылі «варожую сутнасць» гарбачоўскіх паслаблянняў і пачалі адкрыта крытыкаваць гэты курс. Аднак большасць насельніцтва з разуменнем сустрэла новы закон.

Было сказана

Кузьма ЧОРНЫ, пісьменнік, драматург, публіцыст:

«Маленькія і нязначныя здарэнні слабым здаюцца вялікімі і страшнымі. Вялікія і страшныя здарэнні моцным здаюцца маленькімі і нязначнымі».

ШАШКІ

Пад рэдакцыяй міжнароднага арбітра Мікалая ГРУШЭЎСКАГА

ПЕРАМОЖЦЫ АДЗНАЧАНЫ

Конкурсы «Пагода ў доме» праводзяцца намі пад эгідай калектыву Свіслацкага прадпрыемства жыллёва-камунальнай гаспадаркі. У дзявятым з іх упэўнена выступіў Ігар Ананіч **(на фота)**. «Ужо амаль 20 гадоў працую выкладчыкам Гродзенскага дзяржаўнага аграрнага ўніверсітэта. Яшчэ рыхтую падручнікі. У 2006 годзе ўбачыла свет мая кніга «Экономика and программирование», — піша Ігар Гар'евіч. — На мой погляд, старадаўняя гульня выхоўвае шмат добрых якасцяў: мэтанакіраванасць, здаровае славалюбства, сілу волі, характар, нестандартнае мысленне, павагу да сапернікаў, канкурэнтаў і апанентаў. Усё гэта крайне неабходна ў жыцці».

Лаўрэатамі конкурсу таксама сталі Уладзімір Бандарык (в. Лугавая Слабада Мінскага раёна), Аляксандр Белы і Пётр Шклудаў (Наваполацк), Уладзімір Валчкоў (Маладзечна), Аляксандра Камінская (Вілейка), Сяргей Нячаеў (Баранавічы), Віктар Талкачоў (в. Уздзевічы Клімавіцкага раёна) і Віктар Шульга (Мінск). Усе яны і суддзя спаборніцтва Мікалай Грушэўскі адзначаны.

Хутка мы аб'явім новы конкурс. Сачыце за выпускамі нашай рубрыкі «Шашкі».

АЎТАРСКІ-19

Яго працягвае Дзмітрый Камчыцкі — вядомы майстар шашачнай кампазіцыі з Магілёва. Для пераможцаў конкурсу ён падрыхтаваў сюрпрызы. У чарговых заданнях традыцыйна гульню пачынаюць белыя і выйграюць:

№ 19/9. **Белыя**: b4, c5, d4, d6, e5, f4, h2(7). **Чорныя**: a5, b2, d2, h4, h6 (5).

№ 19/10. **Белыя**: a3, d4, e5, f4, f6, g5, h2, h4 (8). **Чорныя**: b6, c5, d2, g7, h6, h8 (6).

№ 19/11. **Белыя**: a3, b2, c3, d2, d4, e3, f2 (7). **Чорныя**: b6, b8, c5, d6, f6, f8, h4 (7).

№ 19/12. **Белыя**: c3, d4, d6, e3, e5, f4, g3 (7). **Чорныя**: a3, a5, a7, b6, e7, f8, h6 (7).

№ 19/13. **Белыя**: a3, a7, b4, c3, c5, d4, e3 (7). **Чорныя**: a5, b6, b8, g3, g5, g7 (6).

❍❍❍

Тэрмін для адказаў традыцыйны — два тыдні.

Накіроўвайце іх на адрас: ***220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а, рэдакцыя газеты «Звязда», рубрыка «Шашкі».***

РАШЭННІ

«Аўтарскі-17» (П. Шклудаў): **17/14** — fg5 (h6:f4) g7, g3, b8...+, **17/15** — fg5 (h6:f4) c7, g3, b8...+, **17/16** — ab2 (de5A) c3, f8 (f4B) d6 (e3) f4, f4+. A(c3) d4 (de5) g7(c3) e5+. B(d4) b4 (e3) e1 (e5) g7 (d4C) h8+. C(f4) h8 (g3) h4 (d2) c3+ і **17/17** — b8 (d4ABC) a5 (b2) bc7, a1+. A(f6) a7 (c3) c7, a1+. B(c7) f7 (d4) a5 (b2) c3+. C(d6) e5 (c7) b8 (d4) a5 (b2) c3+.

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Па гарызанталі: Навумемка. Мелюск. Гаўон. Сага. Алюр. Фінт. Кадык. Рэха. Гама. Ава. Басок. Навагар. Ара. Роў. Этан. Тужава. Арэна. Пярык. Клан. Рагожа. Вока. Отт. Камар. Тэат. Кардык. Сабо. Тэатуар. Шамякін. **Па вертыкалі:** Нагрувашчванне. Тагі. Сховак. «Ура!». «РэнО». Атмам. Пракат. Інвар. Кэрт. Нага. Арава. Тыпса. Агат. Гар. Шар. Бат. Арад. Ота. Дзюк. Кош. Мілюр. Кабара. Тэава. Рысора. Ром. Оптыка. Пташнік. Кардагін.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	8.46	17.04	8.18
Віцебск	8.42	16.47	8.05
Магілёў	8.36	16.53	8.17
Гомель	8.26	16.57	8.31
Гродна	9.00	17.20	8.20
Брэст	8.54	17.27	8.33

Месяц

Поўня 17 лістапада.
Месяц у сузор'і Цяльца.

Імяніны

Пр. *Аляксандры, Ніны, Анатоля, Васіля, Мікалая, Паўла.*
К. *Альжбеты, Саламеі, Іпаліта, Максіма, Паўла.*

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

— Як вы ставіцеся да таго, што ваш муж бегае за маладзенькімі дзяўчатамі?

— Нармальна. Мая сабака бегае за машынамі, але ж гэта не значыць, што калі яна іх дагоніць, то сядзе за руль.

— Мы ж не кожную пятніцу п'ём!
— Проста ты не кожную памятаеш!..

Аб'ява на плоце: «Званок не працуе! Дражніць сабаку!»

— Як гэта ў каўбасным аддзеле ўсё з хіміі і сурагатаў і нічога няма з сапраўднага мяса! А вунь — прадаўшчыца!

Казка. Было ў бацькі тры сыны. Ведаў жа ён толькі пра аднаго.

caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н.КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), В. КЛЮЧНІК (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, С. ПРОТАС (першы намеснік дырэктара), Н. РАСОЛЬКА, С.РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 22.434. Індэкс 63850. Зак. № 5030.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 18 лістапада 2013 года.